УДК 392.86(476)(091)

# “Рытуальнае” спажыванне гарэлкі ў беларускім грамадстве ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя

***Мяньчэня С.В.***
*Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт”, Мінск*

*“Рытуальнае” спажыванне алкагольных напояў разумееца як спарадычнае ўжыванне алкаголю ў сувязі з пэўнымі традыцыямі і сацыяльнымі з’явамі.*

*Мэтай артыкула з’яўляецца вызначэнне “рытуальных” рысаў у культуры спажывання алкаголю беларускага грамадства канца XIX – пачатку XX ст. і іх уплыву на ідэі цвярозасці і само стаўленне да алкаголю.*

***Матэрыялы і метады.** Артыкул пабудаваны на аналізе разнастайных крыніц, такіх як матэрыялы перыядычнага друку і публіцыстыкі, мастацкія творы, а таксама прац айчынных гісторыкаў, прысвечаных праблеме спажывання алкаголю ў беларускім грамадстве ў адзначаны перыяд.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.** Аналіз крыніц дазваляе вызначыць, што ў традыцыйным беларускім грамадстве на мяжы XIX – пачатку XX ст. моцны алкаголь быў уключаны ў культурныя традыцыі і камунікатыўны працэс. Спажыванне алкаголю насіла пабытовы характар, і, пры ўмовах адпаведнасці традыцыям і памеранасці, не асуджалася.*

***Заключэнне.** Спажыванне гарэлкі сельскім насельніцтвам Беларусі напрыканцы XIX – пачатку XX ст. можна ахарактарызаваць як “рытуальнае”. Яго рысамі з’яўляліся спарадычнасць – спажыванне з нагоды ўрачыстасцей; калектывізм – алкаголь выступаў у якасці дапаможнага інструмента камунікацыі; дастаткова вялікая, часам празмерная, разавая доза; усведамленне бясшкоднасці памераннага спажывання алкаголю і недавер да ідэй абсалютнай цвярозасці.*

***Ключавыя словы:** гарэлка, культура спажывання алкаголю, традыцыйнае грамадства, цвярозасць.*

*(Ученые записки. – 2020. – Том 32. – С. 49–52)*

# “Ritual” Consumption of Vodka in Belarusian Society in the Late XIX – Early XX Centuries

***Mianchenia S.V.***
*Education Establishment “Belarusian State Agrarian Technical University”, Minsk*

*“Ritual” alcohol consumption is understood as the sporadic use of alcohol in connection with certain traditions and social phenomena.*

*The aim of the article is to determine the “ritual” features in the culture of alcohol consumption of the Belarusian society of the late XIX – early XX centuries and their influence on the idea of sobriety and the attitude towards alcohol.*

***Material and methods.** The article is based on the analysis of various sources, such as materials of periodicals and journalism, fiction, as well as works of Belarusian historians on the problem of alcohol consumption in Belarusian society during that period.*

***Findings and their discussion.** The analysis of sources allows us to determine that in the traditional Belarusian society at the turn of the XIX – early XX centuries strong alcohol was incorporated into cultural traditions and the communicative process. Alcohol consumption was of a domestic nature, and, subject to tradition and moderation, was not condemned.*

***Conclusion.** Consumption of vodka by the rural population of Belarus in the late XIX – early XX centuries. can be described as “ritual”. Its features were sporadic – consumption on the occasion of celebrations; collectivism – alcohol acted as an auxiliary tool of communication; a large enough, sometimes excessive, single drink; awareness of the harmlessness of moderate alcohol consumption and distrust of the ideas of absolute sobriety.*

***Key words:** vodka, culture of alcohol consumption, traditional society, sobriety.*

*(Scientific notes. – 2020. – Vol. 32. – P. 49–52)*

*Адрас для карэспандэнцыі:* ***e-mail: men_sv@tut.by*** *– С.В. Мяньчэня*

Сучасная навука трактуе рытуал як дзеянне, заснаванае на надзяленні рэчаў асобнымі (сімвалічнымі) якасцямі. Рытуал служыць сродкам інтэграцыі і падтрымання цэласнасці калектыву, здымае псіхалагічнае напружванне і гарманізуе чалавечую псіхіку [1, с. 575]. Пад тэрмінам “рытуальнае спажыванне алкагольных напояў” разумеецца спарадычнае ўжыванне алкаголю ў сувязі з пэўнымі традыцыямі і сацыяльнымі з’явамі. У такіх выпадках алкаголь выступае як неад’емны атрыбут і дапаможны сродак камунікацыі, што робіць яго ў вачах грамадства “бясшкодным” – спажываць яго могуць і тыя, хто па розных прычынах (уласныя погляды ці сацыяльная забарона) ня п’е ў звычайным жыцці. Падобная “легітымізацыя” алкаголю нясе пэўную небяспеку – разуменне шкоднасці саступае традыцыям і пачуццю калектывізму. Нормай будзе лічыцца менавіта спажыванне алкаголю, у той час як адмова ад яго – парушэннем заведзенага ладу. Пры гэтым асноўным з’яўляецца сам працэс распіцця алкаголю, ці нават проста факт яго наяўнасці на стале, а дасягненне ап’янення падаецца пабочным эфектам.

Мэтай артыкула з’яўляецца вызначэнне “рытуальных” рысаў у культуры спажывання алкаголю беларускага грамадства канца XIX – пачатку XX ст. і іх уплыву на ідэі цвярозасці і само стаўленне да алкаголю.

**Матэрыял і метады.** Артыкул пабудаваны на аналізе разнастайных крыніц, такіх як матэрыялы перыядычнага друку і публіцыстыкі, мастацкія творы, а таксама прац айчынных гісторыкаў, прысвечаных праблеме спажывання алкаголю ў беларускім грамадстве ў адзначаны перыяд. Выкарыстанне гісторыка-параўнальнага і гісторыка-сістэмнага метадаў дазволіла прааналізаваць розныя тыпы крыніц і выявіць характэрныя рысы спажывання алкаголю сельскім насельніцтвам Беларусі канца XIX – пачатку XX ст.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У беларускім грамадстве на мяжы XIX – XX ст. памеранае спажыванне алкаголю не лічылася адмоўнай з’явай, але пры гэтым і сам узровень спажывання, у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі, быў дастаткова нізкі – у 1913 г. ён складаў 2,13 л бязводнага спірту на душу насельніцтва (сярэдні паказчык 5 губерняў – Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай), пры сярэднім па краіне ў 3, 25 л [2, с. 21]. Значна адрозніваўся і ўзровень спажывання алкаголю сельскім і гарадскім насельніцтвам. У беларуска-літоўскіх губернях гэты паказчык складаў – 0,24 і 0,94 вядра 40° гарэлкі *(1 вядро = 12,3 л),* што адпавядае 1,18 і 4,62 л бязводнага спірту. Сярэдні паказчык па імперыі складаў 0,41 і 1,37 вядра адпаведна (2,02 і 6,74 л) [2, с. 21]. У сельскай мясцовасці насельніцтва, у пераважнай большасці, без уліку маргінальных элементаў, спажывала алкаголь па святах ды з нагоды значных падзей. Штодзённае п’янства было немагчымым з прычыны неабходнасці вядзення гаспадаркі і недахопу сродкаў. Для сялян, асабліва ў перыяд актыўных гаспадарчых работ, праблема баўлення вольнага часу не з’ўлялася вельмі актуальнай з прычыны адсутнасці апошняга. Гараджане і местачкоўцы ў асноўным з пралетарскай праслойкі, хатніх клопатаў часта былі пазбаўлены, а даступнасць гарэлкі і адсутнасць танных магчымасцей здаровага баўлення вольнага часу спрыялі росту спажывання алкаголю. У гарадскім асяроддзі часта адсутнічалі грамадскія і сямейныя абмежаванні, аўтарытэт бацькі-патрыярха ва ўмовах малой сям’і, якая пераважала ў гарадах, не дзейнічаў. Спажывалі алкаголь тут часцей, але ў вёсцы разавая доза была значна большай. Менавіта ў дачыненні да сельскага насельніцтва Беларусі адзначанага перыяду можна ўжыць тэрмін “рытуальнае спажыванне”.

Алкаголь прысутнічаў у рытуалах, звязаных з адзначэннем важных момантаў жыцця – ад хрышчэння да пахавання – якія не абыходзіліся без святочнага стала. Алкагольныя традыцыі хрышчэння ў паэме “Кепска будзе” адзначаў Ф. Багушэвіч (1840–1900):

Гэтак мяне пахрысціўшы,
Вязуць назад ужо да маткі,
Вочы добра пазаліўшы,
Ледзьве ўняслі да хаткі.
Закусіўшы тут як трэба,
Пакумаліся, і квіта:
Баба ўзяла бохан хлеба,
Пляшку водкі, торбу жыта [3, с. 68].

Карэспандэнт “Нашай Нівы” Стары дзед Міхась адзначаў, што жыхары м. Здзітава (Слонімскі павет) на хрышчэнне звычайна выпівалі 1–2 вядры гарэлкі [4, с. 4].

Значная колькасць гарэлкі спажывалася на вяселлях. Не абыходзіўся без гарэлкі і працэс дасылання сватоў. У камедыі К. Каганца (1868–1918) “Модны шляхцюк” (1910) Якуб, сват Пранцішка, не можа ніяк прыступіць да справы і саромеецца, бо прыйшоў да бацькі Ганны без бутэлькі, а той сам частуе яго. Тое, што будучы жаніх не прыйшоў і забараніў несці гарэлку, сват называе “модай”, на што гаспадар адказвае: “Мода – модаю, а звычай – святое дзела” [5, с. 156]. Ад такога сватання нічога добрага ўжо і не чакалася, а вось сват Ігнася Андрэй з’явіўся па ўсіх традыцыях, што ў пэйнай ступені спрыяла шчасліваму фіналу [5, с. 166].

Частаванне гасцей на вяселлях патрабавала значных фінансавых сродкаў, улічваючы, што адзначалі некалькі дзён запар. Стары дзед Міхась апісваў норавы здзітаўцаў: “Запоіны – пасля сватоў, каштуюць ад 10 да 20 рублёў. Вяселлі святкуюць па 3–4 дні, а часам і тыдзень, адным швом дзень і ноч п’юць праклятую атруту. Затраты – у мужыка з сярэднім дастаткам – 30–40 руб., у заможнага – 80–100 руб.”. Пры свойскай гаспадарцы, якая дазваляла накрыць стол і забяспечыць гасцей закускай, амаль уся гэтая сума ішла на алкаголь [6, с. 2]. У в. Ставок (Пінскі павет) у 1908 г. “было ў прыходзе каля 49 вяселляў. Дзеля таго мужыкі пілі блізка цэлы месяц, чуць не да «вырве назад» як кажуць” [7, с. 7]. Спробы абмежаваць працягласць вяселляў

асаблівых поспехаў не мелі. "Гродзенскія епархіяльныя ведамасці" паведамлялі, што ў адным з прыходаў малады святар з мэтай абмежавання п'янства арганізаваў сход, які прыняў пастанову, што вяселле павінна адзначацца толькі 2 дні. Тыя, хто парушыць пастанову, павінны былі выплаціць штраф 5 руб., суму здавалі святару ў якасці залога пры вянчанні. Сход адзінагалосна пагадзіўся, але, калі прыйшоў час вяселляў, першыя не пажадалі здаваць грошы, чакаючы, што хтосьці падасць прыклад, наступныя спасылаліся на тое, што не плацілі першыя [8, с. 178].

Вяселле ж без алкаголю выклікала ў грамадства неадназначную рэакцыю. Аўтар выдання "Водка" (1907) А. Пшчолка (1869–1943) апісвае падобнае вяселле, арганізатарам якога ён з'яўляўся. Маці жаніха "ревмя-ревела, что они (*маладыя.* – М.С.) теперь пропадут на белом свете от стыда". Суседзі здзівіліся: "Что это за веселье? Это чмур один, а не веселье; такое и житье будить у их, ежели и капли горелки у роте не будить!". Бабы і старыя да святочнага стала з гарбатай не пайшлі, а тыя, хто быў, сварыліся: "Хварей их голова с их весельем, мы губы обпалили ихним чаем! Нам бы горелки!". Адзін з вяскоўцаў – Лявон-чарадзей абяцаў зачараваць вясялле з прычыны, што яго не пачаставалі. Само вяселле скончылася ў 3 гадзіны пасля палудня, што таксама выклікала здзіўленне суседзяў [9, с. 15].

Традыцыю частаваць людзей на пахаваннях падтрымлівалі не толькі сяляне. У 1913 г. каля Радашковічаў на пахаванні пана Валадковіча яго сыны загадалі выдаць людзям гарэлкі "колькі хто хоча". Справа скончылася смерцю аднаго селяніна, іншага ледзь уратавалі [10, с. 3]. У в. Вялікія Канюшаны (Лідскі павет): "Мужыкі, хаваючы нябожшчыкаў, прапіваюць многа грошэй, як на вяселлі, але падумаць аб доктары, каб ён лячыў хворых ніхто не хоча, кажуць дорога будзе каштаваць" [11, с. 6]. Селянін Мікіта Хват, былы работнік святара Е.П. на прапанову апошняга не купляць гарэлку і піва на пахаванне маці адказаў: "А як батюшкова маты померлы, то кулько горілкы і пыва переносів я от Грівца за трі дні? А кулько еще вина брали с погреба?! Правда, дешевша тогды была горилка, а все таки рублыв на пятьдесят выпили тогды разных напитков. То як-же ж мужыку без горилкы обыйстись?!"[1] [12, с. 462].

А. Пшчолка паведамляў, што пры адсутнасці алкаголю (ці нязначнай яго колькасці) на памінках суседзі маглі і праігнараваць пахаванне. Бедны селянін Мікіта купіў на пахаванне бацькі 2 кварты гарэлкі *(тут 1 кварта = 1/20 вядра ці 0,615 л. –* М.С.*)* і ў выніку "пришли на похороны только три мужчины да две бабы. Чуть-чуть Янка с Григором согласились домовину построить, да яму вырыть" [9, с. 3]. Такія паводзіны суседзяў даволі цынічныя, таму паўстае пытанне аб тым, наколькі была пашырана падобная практыка.

Спажыванне алкаголю на святах з'яўлялася ва ўсведамленні часткі грамадства неад'емным атрыбутам, адсутнасць якога парушала заведзены лад. Ва ўмовах забарончых мер Першай сусветнай вайны гэта ў пэўнай ступені паспрыяла росту самагонаварэння і вытворчасці алкагольных сурагатаў. Працэс усведамлення новых умоў жыцця добра адлюстраваны ў апавяданні "Браварнічы" (1914) Язэпа Гаротнага, галоўны персанаж якога вырашае выгнаць спірт з палітурнага лака напярэдадні Дзядоў: "Заўсёды свята праводзілася сваім звычайным парадкам… Збіраюцца грошы. Нясуць папу; ён адбывае "закупную" імшу. Моляцца за нябожшчыкаў. Потым… П'юць па чарцы – зноў за нябожшчыкаў. Закусваюць і п'юць. Халімон – хоць ён і не горкі п'яніца – першы раз у жыцці адчуў, як яму дорага чарка гарэлкі" [13, с. 3].

Спажыванне алкаголю было часткай камунікацыйнага працэсу, гарэлку часцей спажывалі калектыўна – на талацэ, кірмашах, пад час сходаў.

Адзін з лідараў цвярозага руху ў Расійскай імперыі Д. Булгакоўскі (1843 – пасля 1918), які доўгі час служыў святаром на тэрыторыі Беларусі, у адным са сваіх дакладаў пазначаў: "Весьма распространён также между духовенством обычай приглашать прихожан в один из праздничных или воскресных дней на так называемую "помочь": на жниво, покос, молотьбу. Помочан, обыкновенно, священник угощает вином, конечно и сам выпивает при этом случае. Не пить, угощая, не принято" [14, с. 34].

Цікавая традыцыя адзначалася ў вёсцы Прысёлкі (Мінскі павет): "Як толькі прыйдзе якое свята, дык усе збяруцца да аднаго гаспадара, садзяцца каля стала, а той выносіць кварту-дзве гарэлкі. На другое свята пераходзяць да другога, і так праз усю вёску, а калі ў свята не ўсе сабраліся, то з раніцы прыходзяць снедаць" [15, с. 4].

Важнай падзеяй з'яўляліся валасныя сходы, пад час якіх збіраліся мясцовыя гаспадары. Для занятых індывідуальнай гаспадаркай людзей валасны сход даваў магчымасць сустрэцца з вяскоўцамі, пагутарыць у вольны час.

Прысутнічаў на сходах і алкаголь, негледзячы на тое, што законам забараняўся продаж гарэлкі ў гэты дзень. Распіццё адбывалася на месцы, без разліву па чарках і закускі. Такі сход апісвае ў апавяданні "Выбаршчык Андрэй" (1907) Якуб Колас (1882–1956): "Мужыкі нецярпліва чакалі Андрэя з выбараў. На трэці дзень, калі Андрэй павінен быў прыехаць дадому, цэлая грамада мужыкоў у доўгіх кажухах, з люлькамі высыпала на вуліцу каля манапалькі і шумела, як лес у вецер. А як рабіць тут не было чаго, то сягды-тагды можна было чуць, як стукала саракоўка *(1/40 вядра ≈ 0,3 л. –* М.С.*)* аб тоўстую мазолістую руку і як галгатала гарэлка, пераліваючыся проста з бутэлькі ў мужыцкае горла. Тут былі і такія, што паспелі налізацца і спявалі песні. А Антось Байбак нават пайшоў у скокі і баранаваў пясок на вуліцы старымі ботамі, на якіх не хапала аднаго абцаса" [16, с. 671].

[1] Захавана арфаграфія арыгінала.

У Я. Коласа прысутнічае і апісанне распіцця гарэлкі на кірмашы. Галоўны герой апавядання “Кірмаш” (упершыню было апублікавана пад псеўданімам Тарас Гушча) Пятрусь бачыць такую карціну: “Ешчэ большая грамада народу стаяла каля дому з вывескаю: «Казённая вінная лаўка № 67». Тут былі бабы і мужчыны. Хто выбіваў корак с кварты, с поўкварты *(1/2 кварты = 1/40 вядра ≈ 0,3 л. –* М.С.*)*, а хто, адвярнуўшыся ад людзей, каб не сароміць іх, з маленькага кручка *(1/100 вядра ≈ 120 г. –* М.С.*)*. З двадцаць мужыцкіх галоў было задрана ў гару так, што нос прыходзіўся як раз проці самой сярэдзіны неба. Хто піў з вялікай бутэлькі, той трымаўся сьмела: станавіўся на самае віднае мейсцэ, падпіраў аднэю рукою бок і важна цягнуў гарэлку. А калі хто ішоў з «буслам» *(1/4 вядра ≈ 3 л. –* М.С.*)*, прад тым мужыкі разступаліся і давалі дарогу, як якому спраўніку” [17, с. 50–51]. Дадзены ўрывак цікавы па некалькіх прычынах. Па-першае, гэта факт публічнага распіцця гарэлкі жанчынамі. Для традыцыйнага грамадства гэта было выключнай з’явай. Аднак змены ў структуры гандлю алкаголем – дамініраванне вынаснога продажу праз сістэму казённых вінных крам (манаполек) – і сацыяльныя працэсы другой паловы XIX – пачатку XX ст. прывялі да таго, што дадзеная карціна не выклікала абурэння і асуджэння ў масавай свядомасці. Па-другое, адзначаная градацыя прысутных па прынцыпу тары. Той, хто мог сабе дазволіць патраціць больш грошай на алкаголь, трымаўся з годнасцю і заслугоўваў “павагу” іншых. Што датычыцца самога героя апавядання, то ён, напіўшыся на кірмашы, ледзь не страціў каня і даў зарок не піць гарэлку [17, с. 54].

Традыцыі “рытуальнага” спажывання алкаголю аказвалі ўплыў на адносіны беларускага насельніцтва да ідэй абсалютнай цвярозасці. Так аграном В. Бруноўскі ў лісце да епіскапа Мінскага Мітрафана прапаноўваў замяніць пункт 3 Статута таварыства цвярозасці пры Аршанскай саборнай Уваскрасенскай царкве, які вызначаўся як тыповы для Мінскай губерні. Зыходны варыянт: “не будет пить вина, водки, пива и вообще ничего хмельного” на “даёт клятвенное обещание перед Господом Богом, что всеми мерами и силами и всем своим помыслом будет воздерживаться от потребления напитков, опьяняющих тело, поганящих душу, твёрдо памятуя, что пьяницы Царства Божия не наследуют и что в одной рюмочке есть зло” [18, с. 8]. Дадзеная мера тлумачылася тым, што сяляне не жадаюць уступаць у таварыствы з прычыны катэгарычнай клятвы не браць у рот спіртнога. Жыхары м. Горкі ў 1914 г. тлумачылі свае адносіны да мясцовага таварыства цвярозасці наступным чынам: “Пыталі, чаму не запісваюцца, адказваюць – без гарэлкі жыць нельга, трэба піць яе на хрэсьбінах, памінках, хаўтурах, барышах, хрэсным ходзе, і іншы раз купіўшы, ці прадаўшы. Іншыя кажуць – калі не піць – то ўсім. Тады яе і рабіць не трэба” [19, с. 4]. Колькасць зафіксаваных на тэрыторыі Беларусі таварыстваў цвярозасці ў пачатку XX ст. была значна ніжэйшай за сярэдні паказчык па Расійскай імперыі, пры гэтым значная колькасць членаў таварыстваў давала абет ўстрымання толькі на пэўны перыяд [20, с. 110].

**Заключэнне.** Такім чынам, спажыванне гарэлкі сельскім насельніцтвам Беларусі напрыканцы XIX – пачатку XX ст. можна ахарактарызаваць як “рытуальнае”. Яго рысамі з’яўляліся спарадычнасць – спажыванне з нагоды ўрачыстасцей; калектывізм – алкаголь выступаў у якасці дапаможнага інструмента камунікацыі; дастаткова вялікая, часам празмерная, разавая доза; усведамленне бясшкоднасці памеранага спажывання алкаголю і недавер да ідэй абсалютнай цвярозасці. Пры гэтым п’янства на вёсцы мела пераважна пабытовы характар і не было сацыяльнай з’явай, аднак далейшыя падзеі XX ст. спрыялі алкагалізацыі грамадства.

## Літаратура


1. Новейший философский словарь / сост. А.А. Грицанов. – Минск: Изд.-во В.М. Скакун, 1998. – 896 с.
2. Протько, Т.С. В борьбе за трезвость / под ред. М.О. Бича. – Минск: Наука и техника, 1988. – 165 с.
3. Багушэвіч, Ф. Выбраныя творы / Ф. Багушэвіч; уклад. з тэксталагіч. падрыхт., прадм. і камент. Язэпа Янушкевіча. – Мінск: Беларус. навука, 2015. – 445 с.
4. Наша ніва. – 1912. – № 8.
5. Каганец, К. Творы / Карусь Каганец [Уклад., прадм. і камент. С. Алексадровіча]. – Мінск: Маст. літ., 1979. – 264 с.
6. Наша ніва. – 1913. – № 23.
7. Наша ніва. – 1908. – № 31.
8. Свящ. N.N. Благое начинание и печальный конец // Гродненские епархиальные ведомости. – 1912. – № 16/17. – С. 177–178.
9. Пщёлко, А.Р. Водка (ответ крестьянам) / А.Р. Пщёлко. – Вильно: Типография «Русский почин», 1907. – 22 с.
10. Наша ніва. – 1913. – № 11.
11. Наша ніва. – 1908. – № 6.
12. Е.П. «Врачу, исцелися сам!» // Гродненские епархиальные ведомости. – 1909. – № 42.
13. Наша ніва. – 1914. – № 45.
14. Скидан, В.И. Народ против пьянства / В.И. Скидан. – Минск: Наука и техника, 1988. – 77 с.
15. Наша ніва. – 1910. – № 37.
16. Колас, Я. Выбраныя творы / Я. Колас; уклад., прадм., камент. М. Тычыны. – Мінск: Кнігазбор, 2007. – 720 с.
17. Гушча, Т. Апаведаньня / Т. Гушча. – Вільня: Друкарня “Прамень”, 1912. – 63 с.
18. Бруновский, В.Х. Согласие против пьянства и агрономическая помощь сельскому населению Минской губернии. – Минск: Электротипография С.А. Некрасова, 1914. – 8 с.
19. Наша ніва. – 1914. – № 5.
20. Мяньчэня, С.В. Станаўленне таварыстваў цвярозасці на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. / С.В. Мяньчэня // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе: сб. науч. ст. по материалам III Междунар. науч. конф., Пинск, 30 нояб. – 1 дек. 2018 г. / Полес. гос. ун-т; под ред. Р.Б. Гагуа. – Пинск: ПолесГУ, 2018. – Вып. 3. – С. 105–110.


*Паступіў у рэдакцыю 28.09.2020*